знання можливо виявити тільки на рівні персоніфікації, коли особа – творець і носій галузевого знання, пов'язана з географічним місцем або державою.

Значно деталізованішими уявлення корифеїв української науки про змістовне наповнення українознавства були відносно складності його наукового предметового простору. В цьому сенсі слід згадати цитовані нами визначення поняття «українознавство» за М. Грушевським та С. Єфремовим. Цілком закономірними в історії УАН виявляються методологічні розбіжності щодо організаційної структури Академії між видатними діячами національної науки [10, с. 217]. Бажання учасників організації УАН охопити всі наукові паростки етнічного знання і при цьому наслідувати світові зразки інституціональної організації науки були реальною мотивацією активної діяльності для всіх. Єдино можливі рішення доволі чітко простежуються за розглядом класифікаційної системи наук М. Дьюї. Автор виділив три групи наук, які мають переважне значення при розгляді цивілізаційності культурного середовища світу, регіону, держави. Це – «суспільні науки», «природничі науки і математика», «техніка (прикладні науки)». За фактом роботи Комісії для вироблення законопроекту про заснування Української академії наук було ухвалено організаційне рішення про структурні підрозділи: Перший відділ історично-філологічних наук, Другий відділ фізико-математичних наук, Третій відділ соціальних наук [2, с. 166]. На основі цього рішення з історії виникнення УАН, було зроблено висновки про домінування концепції М. Грушевського при обговоренні організаційно-галузевої структури Академії. Адже першим відділом було визнано саме історико-філологічний цикл наук, представником якого був сам учений. Можливо, таке трактування має сенс при розгляді внеску корифеїв української науки в розбудову УАН у межах лінійності історичного процесу. Як цілісне надбання світової культури український культурний розвиток мав національно-особливе на рівні історичного буття. Можливо, структурні особливості УАН і були виявом етнічно-національного, збігаючись із трактуванням концепції М. Грушевського. Водночас національно-особливе визначалось і загальносвітовим баченням ієрархічної підпорядкованості (структури) знання. Згадаємо в цьому сенсі становище «суспільних наук», які випереджали всі інші галузеві комплекси за класифікацією М. Дьюї. Європейська модель Академії наук, виразником якої вважається В. Вернадський, відкидаючи регіональні риси, теж увібрала визнаний у світі поділ наук за соціальною значущістю в реальному бутті. Йдеться про змістовне спрямування наук Другого фізико-математичного і Третього соціального відділів УАН. Тобто, в первинному статутному організаційному поділі науки в УАН було представленовсіпанівні галузі світової науки, які забезпечували прогресивний розвиток держави в бік цивілізованості, а саме «природничі» й «соціальні» науки з наявним ухилом у прикладний бік. Прикладний характер номотетичного знання забезпечує певну місткість національного компоненту.

Для визначення міри українськості в новоутвореній УАН слід звернути увагу на фактор інформаційної насиченості саме знання, представленого в першому структурному відділі УАН, яке напрацювали українці. Гуманітарний галузевий комплекс, сформований до виникнення УАН, мав не тільки вивірене системне знання про український етнос, але й довершене інформаційне забезпечення. Інформаційне забезпечення української науки слід розглядати як складну систему, яка вміщує не тільки матеріалізований продукт у формі усталених бібліографічних форм існування інформації, але і явища діяльнісного порядку. Динамічне накопичення інформації, через продуктивну боротьбу українців за право самовизначення на окремих історичних етапах, слугувало постійним джерелом наукового аналізу українського суспільства, виразником натхнення для формулювання нових гуманітарних концепцій знання про українське буття.

**1**. *Гіденс Е.* Нестримний світ: як глобалізація перетворює наше життя / Гіденс Е. – К.: Альтерпрес,2004. – 100 с. **2**. Історія Академії наук України. 1918–1923. Документи і матеріали. – К.: Наукова думка,1993. – 375 с. **3**. Михайло Грушевський – науковець і політик у контексті сучасності. – К.: Українська Видавнича Спілка, 2002. – 399 с. **4**. *Петрикова В. Т.* Історія виникнення та становлення Української Академії наук (УАН) у контексті гуманітарної культури Європи / В. Т. Петрикова // Українознавчий альманах. – Вип. 17. – К., 2014. – С. 139–142. **5**. *Самардак М. М.* Філософія науки: напрями, теми, концепції / Самардак М. М. – К.: ПАРАПАН, 2011. – 207 с. **6**. *Семенов Ю. М.* Философия истории / Семенов Ю. М. – М.: Современные тетради, 2003. – 705 с. **7**. Україна і світ: етнічні, науково-інтелектуальні та освітні виміри. Збірник наукових праць / Упоряд. І. Грабовська, В. Піскун, В. Сергійчук. – К.: Українська Видавнича Спілка,2004. – 352 с. **8**. Українознавство: Навчальна програма нормативної дисципліни для вищих закладів освіти. – К.: Міленіум, 2004. – 152 с. **9**. *Устюгова Е. Н.* Стиль и культура: опыт построения общей теории стиля / Устюгова Е. Н. – 2-е изд. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2006. – 260 с. **10**. Філософія українського буття: Монографія / І. М. Грабовська, Т. М. Ємець, О. І. Мостяєв. – К.: Українська Видавнича Спілка, 2006. – 295 с.

УДК 94(476)+323.15(476)

*Ігар Пушкін*

## Дзейнасць грамадскіх арганізацый украінскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2014 гг.)

*Ігор Пушкін*

## Діяльність громадських організацый української спільноти в республіці Білорусь (1991–2014 рр.)

*У статті розкрито та проаналізовано процес створення і особливості діяльності громадських організацій національних спільнот Республіки Білорусь. Розглянуті цілі і програмні напрями розвитку національних громадських організацій українців у Білорусі в період 1991¬–2014 рр. Проаналізовано громадські, культурні та освітні заходи. Зроблено висновок про значну роль українців у громадському та культурному житті Білорусі, а також у формуванні громадянського суспільства.*

**Ключові слова:** *Білорусь, українська діаспора, громадські організації українців.*

*Ihar Pushkin*

## Public Organizations' Activities of the Ukrainian Community in the Republic of Belarus

*The process of creation and activity of the public organizations of national communities in the Republic of Belarus is analyzed in the article. The aims and directions of development of national public organizations of Ukrainians in Belarus in the Period of 1991–2014 are looked thorough. There public, cultural as well as educational actions are analyzed. The author comes to the conclusion about the significant role of Ukrainians in public and cultural life in Belarus as well as in the formation of civil society.*

**Keywords:** *Belarus, Ukrainian Diaspora, Public Organizations of Ukrainians.*

*Игорь Пушкин*

## Деятельность общественных организаций украинской общности в Республике Беларусь (1991–2014)

*В статье раскрыт и проанализирован процесс создания и особенности в деятельности общественных объединений национальных общностей в Республике Беларусь. Рассмотрены цели и направления развития национальных общественных организаций украинцев в Беларуси в период 1991–2014 гг. Проанализированы общественные, культурные и образовательные мероприятия. Сделан вывод о значительной роли украинцев в общественной и культурной жизни Беларуси, а также в формировании гражданского общества.*

**Ключевые слова:** *Беларусь, украинская диаспора, общественные организации украинцев.*

Украінцы складаюць чацвёртую па колькасці этнічную групу ў Беларусі (перапіс насельніцтва 1999 г. – 2,4 %, 2009 г. – 1,7 % або 158723 чал.). Яны пражываюць, з большага, у Мінску, буйных гарадах усходняй часткі краіны і ў Брэсцкай вобласці [11].

Грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся ў Рэспубліцы Беларусь напрыканцы XX ст. далі адчувальны штуршок развіццю беларускай нацыянальнай культуры і культуры нацыянальных меншасцей (згодна Канстытуцыі ўжываецца тэрмін "нацыянальныя супольнасці"), што садзейнічала росту іх палітычнай і нацыянальнай свядомасці. У гэтай справе важнае значэнне мае працэс стварэння і дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый (НГА). Яны развіваюць актыўнасць і самадзейнасць асоб, задавальняюць іх запатрабаванні і інтарэсы. Іх работа мае непасрэдны ўплыў на грамадскае і культурнае жыццё краіны.

У Рэспубліцы Беларусь сфарміравалася такая мадэль дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных супольнасцей, пры якой вядучая роля адводзіцца дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў пры фінансавай, прававой, арганізацыйнай падтрымцы і кантролі з боку дзяржаўных структур.

Першыя грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей узніклі ў канцы 1980-х гг. На сярэдзіну 1990 г. у БССР дзейнічалі 11 нацыянальных культурна-асветных таварыстваў і аб'яднанняў [3, арк. 14]. У студзені 1991 г. было створана Рэспубліканскае беларускае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў "Ватра" [5, с. 387–388].

У 1993 г. прадстаўнікі грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей Беларусі прынялі заяву аб сумеснай дзейнасці па стварэнні такой дзяржавы, дзе будуць гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці. Супольную заяву падпісалі прадстаўнікі ўкраінскай, яўрэйскай, татарскай, польскай, нямецкай, літоўскай нацыянальнасцей і згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" [2, с. 47].

У 2005 г. у Беларусі дзейнічалі 123 грамадскя арганізацыі і іх саюзы, якія прадстаўлялі 24 нацыянальныя супольнасці. Сярод арганізацый – 47 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азербайджанскіх, украінскіх і татарскіх, 4 цыганскіх, 3 армянскіх, па 2 грэчаскія і грузінскія. Таксама былі нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкіраў, грузінаў, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, туркаў, чувашоў, эстонцаў [1]. 38 арганізацый мелі статус міжнародных і рэспубліканскіх. На 01.01.2015 г. дзейнічалі 212 аб'яднанняў 26 нацыянальнасцей [10].

Для дасягнення статутных мэт грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей дзейнічалі самастойна, абапіраючыся на ўласны інтэлектуальны і матэрыяльны патэнцыял або выкарыстоўвалі дапамогу ўладаў Рэспублікі Беларусь ці краіны паходжання супольнасці. Каб найлепш вырашаць пэўныя задачы часам аб'ядноўваліся разам.

Так, напрыклад, 30.01.1996 г. украінскае грамадска-культурнае таварыства Брэсцкай вобласці, Брэсцкае яўрэйскае культурна-асветніцкае таварыства "Тарбут", абласной адзел саюзу палякаў і адзел рускага таварыства падпісалі сумесную заяву арганізацый нацыянальных абшчын вобласці. У ёй гаварылася, што таварыствы будуць развіваць і ўмацоўваць супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі нацыянальных абшчын на аснове павагі і ўзаемнага даверу, будуць адстойваць правы чалавека і інтарэсы нацыянальных супольнасцей на аснове безумоўнага выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і адпаведных міжнародных пагадненняў. Заяўлялася аб развіцці канструктыўнага, раўнапраўнага супрацоўніцтва з органамі ўлады усіх узроўняў, з мэтай забеспячэння нацыянальным супольнасцям Брэстчыны магчымасцей для захавання і развіцця іх мовы, культуры, традыцый і абрадаў.

У структурах Міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі Рэспублікі Беларусь працавалі спецыялісты, якім было даручана аказваць дапамогу грамадскім нацыянальна-культурным аб'яднанням. У 1994 г. быў створаны Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. На яго базе дзейнічалі шэраг самадзейных мастацкіх калектываў нацыянальных супольнасцей: хоры ўкраінскай і польскай песні, хор "Руская песня", дзіцячыя ансамблі ўкраінскага танца і польскай песні, вакальны ансамбль "Шматгалоссе".

Грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей Беларусі для захавання нацыянальных традыцый і прапаганды сваёй культуры стварылі вялікую колькасць самадзейных калектываў. Так у 2004 г. дзейнічала 350 творчых калектываў, створаных НГА 15 супольнасцей, з іх 96 украінскіх, якія арганізавалі і правялі больш за 160 мерапрыемстваў [4, арк. 30]. Найбольш маштабнымі мерапрыемствамі ў справе адраджэння і развіцця культур нацыянальных супольнасцей Беларусі сталі Рэспубліканскія фэстывалі нацыянальных культур, якія праводзяцца адзін раз на два гады ў г. Гродна. X фестываль адбыўся ў 2014 г.

(першы ў 1996 г.). На кожным з іх належным чынам была прадстаўлена ўкраінская дыяспара ў Рэспубліцы Беларусь.

Ролю НГА у грамадзянскай супольнасці і ўдзел нацыянальных супольнасцей у грамадскім і культурным жыцці Беларусі дазваляе зразумець аналіз дзейнасці грамадскіх арганізацый украінцаў.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічалі: Рэспубліканскае беларускае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў "Ватра" (г. Мінск), якое каардынавала работу: грамадскай арганізацыі ўкраінцаў "Радзіслаў" (г. Віцебск), культурна-асветніцкіх таварыстваў "Верхавіна" (г. Гомель), "Краяны" (г. Маладзечна), "Обрій" (г. п. Калодзішчы, Мінскі раён), "Заповіт" (г. Мінск), "Славуціч" (г. Бабруйск,), грамадскага аб'яднання ўкраінцаў "Дніпро" (г. Магілёў); навукова-педагагічны саюз "Берагіня" (г. Брэст), грамадскае аб'яднанне культурна-асветнае адзінства ўкраінцаў "Палессе" (г. Брэст), аб'яднанне ўкраінцаў "Барвінак" (г. Гродна), грамадскае аб'яднанне "Цэнтр украінскай культуры "Січ" (г. Мінск) [7, арк. 61–64, 74–77, 87–90]. З канца 1990-х гг. праводзілася падрыхтоўчая праца па скліканню ўстаноўчай канферэнцыі з'езда ўкраінцаў Беларусі [14, с. 9–10].

Як вынік плённай працы ўкраінскай супольнасці ў Беларусі, варта адзначыць наступныя мерапрыемствы. 29.05.1999 г. Цэнтр украінскай песні "Січ" правёў V рэспубліканскі фестываль мастацтваў украінцаў Беларусі ў канцэртным зале Белдзяржфілармоніі (г. Мінск). 23.01.2001 г. ГА украінцаў "Ватра" правяло літаратурную вечарыну, якая была прысвечана ўкраінскай паэтцы Л. Украінке і 100-годдзю яе наведвання Беларусі. Фінансавыя сродкі на яе правядзенне выдаткавала Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [8, арк. 58–60]. 27.04.2002 г. у Мінску адбыўся VI Рэспубліканскі фестываль мастацтваў украінцаў Беларусі. З 13.08.2004 г. па 15.09. 2004 г. у Мінску ў Дзяржаўным літаратурным музеі Я. Купалы працавала выстава "Пайшло слова Тарасова горда, непакорна…", якая была прысвечана 190-годдзю з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі і прымеркавана да Дня Незалежнасці Украіны. У адкрыцці выставы (13 жніўня) браў удзел фальклорны ансамбль беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў "Ватра" [9, с. 4]. Пры падтрымцы амбасады Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, членаў украінскіх грамадскіх арганізацый у Мінску і Брэсце (2002 г.), Магілёве (2005 г.) былі адкрыты помнікі ўкраінскаму кабзару Тарасу Шаўчэнку. У 2007 г. амбасада Украіны і грамадская камісія па ўшанаванню памяці Піліпа Орліка, ураджэнца в. Касута (цяпер Вілейскі раён Мінскай вобласці) і аўтара першай Канстытуцыі Украіны, наладзілі святкаванне 335-годдзя з дня яго нараджэння [14, с. 9].

У якасці прыклада патрэбна прывесці асноўныя кірункі дзейнасці некаторых грамадскіх арганізацый украінцаў. З 1995 г. бярэ пачатак дзейнасць ГА "Цэнтр украінскай культуры "Січ" у г. Мінску. Аб'яднанне было ўтворана з мэтай – садзейнічаць захаванню і развіццю ўкраінскай культуры, самаідэнтыфікацыі ўкраінскага этнаса ў Рэспубліцы Беларусь, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і гістарычнай памяці, стварэння ўмоў для нацыянальна-культурнага развіцця. Цэнтр аб'ядноўваў каля 50–70 актывістаў, але ў мерапрыемствах грамадскага аб'днання ўдзельнічала да 900 чалавек. З 1997 г. пры ГА ЦУК "СІЧ" працавала нядзельная ўкраінская школа, дзейнічаў хор украінскай песні "Крыніца" (з 1998 г. меў званне народнага), існаваў дзіцячы танцавальны ансамбль і "Клуб сяброў Украіны" [12, с. 87]. У 1996 г. быў утвораны ў г. Брэсце Украінскі навукова-педагагічны саюз Беларусі "Берагіня" з мэтай яднання педагагічных, навуковых і культурных дзеячоў Беларусі ў справе развіцця сістэмы ўкраінскай адукацыі, вывучэння ўкраінскай мовы, культуры, народнай творчасці і нацыянальных традыцый украінцаў. Украінская мова вывучалася ў двух сярэдніх школах Брэста, а таксама ў факультатывах і гуртках у Кобрыне, Драгічынскім раёне. У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце вялася падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй філолаг, выкладчык рускай і ўкраінскай мовы і літаратуры [6, с. 166]. Пры аб'яднанні "Берагіня" дзейнічалі: украінскі студэнцкі эксперыментальны тэатр "Арт-Майдан", турыстычны клуб "Энергія" [12, с. 89–90]. У Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці на базе Калодзішчанскай вясковай бібліятэкі № 2 праводзіла працу культурна-грамадская арганізацыя ўкраінак "Обрый", у яе склад уваходзілі жанчыны ўкраінскага паходжання. Іх дзейнасць займала значнае месца ў грамадскім, духоўным і культурным жыцці раёна. Віцебская грамадская арганізацыя ўкраінцаў "Радзіслаў" актыўна займалася распаўсюджваннем ведаў па гісторыі і культуры Украіны і ўкраінцаў, папулярызацыяй у сваім этнічным асяродку ўкраінскай мовы. Яе сябры прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі Дзён славянскага пісьментства. Пад эгідаю ГА "Ватра" і Камітэта (апарата Упаўнаважанага) па справах рэлігіі і нацыянальнасцей з 2001 г. у Рэспубліцы Беларусь выдаецца газета на ўкраінскай мове "Украінец у Беларусі".

У першай палове 1990-х вылучалася дзейнасць шэрагу грамадскіх арганізацый украінскай супольнасці на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, якія ставілі пытанне аб пражыванні на Палессі вялікай колькасці ўкраінцаў. У прыватнасці, грамадскае аб'яднанне "Прасвіта Берасцейшчыны" імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці, якія выдавалі газеты "Берасцейскі край" і "Голас Берасцейшчыны".

17.09.1999 г. ім было адмоўлена ў перарэгістрацыі і яны прыпынілі сваё існаванне. Гэта адбылося таму, што іх дзейнасць набыла палітычны, прычым даволі радыкальны характар. Кіраўніцтва аб'яднанняў і рэдакцый газет неаднаразова бяздоказна абвінавачвалі ў надрукаваных матэрыялах Рэспубліку Беларусь у прымусовай асіміляцыі і дыскрымінацыі ўкраінцаў, тым самым ствараючы падставы для ўзнікнення міжнацыянальнай напружанасці.

Аб чым сведчаць наступныя факты. Так, у № 6 за 1996 г. газеты "Берасцейскі край" сцвярджалася, што ў Беларусі "вядзецца антыўкраінская кампанія". У № 1 за 1997 г. была выказана думка, што "тэрыторыя Брэсцкай вобласці незаконна ўвайшла ў склад БССР". На старонках газеты адзначалася, што: "у Беларусі пражывае звыш 1 млн украінцаў", "Берасцейшчына – этнічна ўкраінская зямля" (№ 30), "Берасцейшчына заселена этнічнымі ўкраінцамі" (№ 33), "паўсюль у сельскай мясцовасці Брэсцкай вобласці людзі размаўляюць на ўкраінскай мове", "украінцы не могуць без праблемаў чытаць украінскую прэсу, нармальна вучыць дзяцей у ўкраінскіх школах" (№ 34), "практычна з пасляваеннага часу да сёння ідзе метадычная паступовая работа па асіміляцыі народу ўкраінскай Берасцейшчыны" (№ 36, 13.09.1997 г.).

Некаторыя ініцыятары ўкраінскага руху Брэсцкай вобласці заяўлялі аб пачатку складання “негатыўнага рэестру” тых асобаў, якія выказвалі ці выказваюць сваю нязгоду са спробамі ўкраінізацыі Берасцейшчыны. Гэта справа распачалася на старонках, створанага ў 1996 г. “Слоўніка Берасцейшчыны” (аўтар В. Леанюк). У ім Брэсцкая вобласць названа “украінскім краем”, а на старонцы 6 змешчана наступнае: ”мы павінны знайсці і памятаць ненавіснікаў украінства палескага… у такім памеры ведаць, як ведаем нацыянальных герояў, светлых патрыётаў”. Дзіўным, калі не казаць антыбеларускім, выглядае выступ кіраўніка Маларыцкага філіялу ГА “Прасвіта Берасцейшчыны” В. Харсюка на ІІ Сусветным форуме ўкраінцаў. У сваёй прамове, сярод іншага, ён сцвярджаў: ”Наша беларуская дзяржава стараецца скрыць нацыянальную прыналежнасць палескага народу, варожа ставіцца да тых, хто дамагаецца засвядоміць палешукоў, што яны ёсць украінцы”. В. Харсюк звярнуўся наконт Берасцейшчыны да ўкраінскага кіраўніцтва, якое знаходзілася на форуме, з запытам – ”чаму яно, маўляў, не ведае дзе праўдзівая ўкраінская мяжа” [13, с. 321–323].

Варожа ставілася кіраўніцтва ГА “Прасвіта” і да сваіх, нязгодных у чымсці з імі. Напрыклад, да Беларускай асацыяцыі ўкраінцаў “Ватра”.

Не адмаўляючы наяўнасць праблем украінскай этнічнай супольнасці на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, лічу, што дзейнасць падобных арганізацый насіла не канструктыўны характар.

Асаблівасцю культурна-асветніцкага і грамадскага жыцця нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь, у тым ліку ўкраінскай, з’яўляецца наяўнасць трох этапаў.

1) 1991–1995 гг. – час ідэнтыфікацыі і актывізацыя дзейнасці. Праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць НГА. Асноўная ўвага дзяржаўных органаў была накіравана на развіццё адукацыі нацыянальных супольнасцей на іх родных мовах. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць школ, дзе вывучалася мова нацыянальных супольнасцей. Паступова фарміраваліся элементы грамадзянскай супольнасці і актывісцкага тыпу палітычнай культуры насельніцтва, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу.

2) 1996–2000 гг. – заканадаўчае рэгуляраванне і паступовае згортванне ініцыятыў. Нацыянальная палітыка была накіравана на вырашэнне праблем забеспячэння правоў нацыянальных супольнасцей і задавальнення этнакультурных запытаў насельніцтва. З 1999 г. назіралася памяншэнне актыўнасці з боку як асобных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, так і НГА.

3) з пачатку 2000-х гадоў – перыяд рэгламенціраванага кантролю з боку дзяржаўных выканаўчых органаў, дзейнасць магчыма толькі ў рэчышчы ўзгодненых і дазволеных мерапрыемстваў. Пераважае падтрымка інтэрнацыянальнага і выкарыстоўванне праграмных метадаў працы. Заўважаецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і моў нацыянальных супольнасцей на карысць рускай.

Такім чынам, украінскія грамадскія аб’яднанні Беларусі праводзілі значную культурна-асветніцкую работу. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць творчых і мастацкіх самадзейных калектываў, якія былі створаны і дзейнічалі пры ўкраінскіх аб’яднаннях і дзяржаўных установах культуры.

Грамадскія арганізацыі ўкраінскай супольнасці пастаянна ўдзельнічалі ў фестывалях нацыянальных культур, захоўваючы нацыянальныя традыцыі і культуру ў асяродку сваёй нацыянальнай супольнасці і прапагандуючы яе сярод насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў украінцаў была сканцэнтравана пераважна ў гарадскіх паселішчах і спрыяла фарміраванню грамадзянскай супольнасці Беларусі. Фактаў парушэнняў заканадаўства з боку ўкраінскіх нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў не было зафіксавана.

Некаторае памяншэнне іх актыўнасці ў апошнія дзесяць год было выклікана, па-першае, некаторымі абмежаваннямі з боку ўлад у стварэнні грамадскіх арганізацый і іх дзейнасці, а, па-другое, агульным становішчам, калі паменшыліся магчымасці рэальных змен шляхам грамадзянскіх ініцыятыў.

Эфектыўная культурна-асветніцкая дзейнасць і самарэалізацыя ўкраінскай супольнасці ў Беларусі, яе высокі сацыяльны статус забяспечвалі адну з галоўных умоў – заахвочванне рэгіянальных і нацыянальна-культурных аб’яднанняў, падтрымку нацыянальных культур і традыцый, якая неабходна для фарміравання грамадзянскай супольнасці і працякання натуральных працэсаў сацыяльных змен у Рэспубліцы Беларусь.

**1**. Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / Складальнік Н. В. Ходар. – Мінск: ”Энцыклапедыкс”, 2004. – 272 с. **2**. *Бурая Н. В.* Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) / Н. В. Бурая // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2007. – № 1. – С. 46–49. **3**. Запіска ЦК КПБ // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4 п. – Воп. 156. – Спр. 775. **4**. Звесткі аб творчай дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб’яднанняў у Рэспубліцы Беларусь // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 474. **5**. *Калюжна Г. Ю.* Діяльність білоруського громадського об’єднання українців “Ватра” по відроджэнню і збереженню мові, культуры і народної творчості українців Білорусі / Г. Ю. Калюжна // Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 387–393. **6**. *Касовіч В. Ф.* Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцей у Рэспубліке Беларусь / В. Ф. Касовіч // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1997. – С. 161–169. **7**. Лісты ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў “Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб’яднанняў вобласці” // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 473. **8**. Матэрыялы аб правядзенні вечарыны // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 473. **9**. Наша слова. – 2004. – 18 жніўня. – С. 4. **10**. Общественные национально-культурные объединения // Уполномоченный по делам религий и национальностей [Электронный ресурс] – http://belarus21.by/Articles/nac_cult_ob. – Дата доступа 22.09.2015 г. **11**. Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т. ІІІ. – Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2011. – 433 с. **12**. *Пушкін І. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. – 206 с. **13**. *Пушкін І. А.* Праявы нацыянальнага экстрэмізму ў дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў на Брэсчыне ў 1990-я гг. / І. А. Пушкін // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў / Гродз. дзярж. ун-т., рэдкалегія: І. П. Крэнь, У. І. Навіцкі, В. А. Белазаровіч (адк. рэдактары). – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 321–323. **14**. *Ціхаміраў А.* Беларуска-украінскія адносіны ў 1991–2006 гг. / А. Ціхаміраў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 2. – С. 3–10.